# Пасябраваць з Кірыліцай

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў галерэі «Лабірынт» пры садзейнічанні супрацоўнікаў бібліятэкі і Нацыянальнага інстытута адукацыі адбылася прэзентацыя «Буквара» — новага вучэбнага дапаможніка для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай выкладання. Выданне падручніка сведчыць аб пачатку новай эпохі ў гісторыі беларускай азбукі і, адпаведна, сыход эпохі папярэдняй...**




*Фота БелТА.*

*Падчас прэзентацыі.*

На працягу дзесяцігоддзяў, ажно да гэтага часу, галоўным ды нават адзіным беларускім букваром з'яўлялася выданне 1969 года за аўтарствам выбітнага культурнага дзеяча Анатоля Клышкі. За перыяд свайго існавання гэтая азбука вытрымала каля 40 перавыданняў і стала адной з самых тыражаваных беларускіх кніг. Тым не менш наспеў час абнавіць правілы, асвяжыць буквар у адпаведнасці з запатрабаваннямі часу і новымі адукацыйнымі падыходамі. З 1 верасня навучанне першакласнікаў праходзіць з выкарыстаннем новага падручніка.

Ва ўрачыстасці ўзялі ўдзел аўтары выдання навукоўцы Вольга Свірыдзенка і Вольга Цірынава, дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Валянціна Гінчук, намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуковай працы і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Суша, дэкан факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка Наталля Ждановіч і намеснік дырэктара мінскай гімназіі № 23 Галіна Полудзень.

Акрамя таго, на прэзентацыю завіталі генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі, мультыплікатары Ірына Тарасава і Канстанцін Андрушачкін. Адной з цэнтральных асаблівасцей актуальнага выдання стала наяўнасць галоўнай гераіні, створанай аніматарамі студыі. Русавалосая дзяўчынка Кірыліца ў мультыплікацыйных сцэнках правядзе дзяцей па ўсіх старонках буквара. Звярнуцца па дапамогу Кірыліцы можна з дапамогай сканавання аднаго з *QR*-кодаў, размешчаных у кнізе.

Такім чынам, новы «Буквар» — не проста азбука, а мультымедыйны вучэбна-метадычны комплекс з цэлым стосам дадатковага матэрыялу. Разам з ім выпускаюцца электронны дадатак «Спадарожнік Буквара», зборнік заданняў «Рабочы сшытак да "Буквара"» і сшыткі з пропісямі. Электронны дадатак складаюць запісаныя відэаўрокі, аніміраваныя пропісі, прэзентацыйныя ролікі аб розных кутках краіны, а таксама некаторыя інтэрактыўныя забавы.

Урачыстая імпрэза завяршылася выступленнем юных навучэнцаў гімназіі. Першакласнікі прачыталі гасцям вершы на беларускай мове.

**Мікіта ШЧАРБАКОЎ**